ЗА ВАМІ СЛОВА, ТАВАРЫШЫ ЗАВОЧНІКІ!

НА ЗАВОЧНЫХ АДДЗЯЛЕННЯХ ФАКУЛЬТЭТАЎ ПАЧЫНАЕЦЦА АДКАЗНАЯ ПАРА — ЛЕТНЯЯ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ.

ТАВАРЫШЫ ЗАВОЧНІКІ! ВАС ГАСЦІННА ЗАПРАШАЮЦЬ КАБІНЕТЫ, БІБЛІЯТЭКА, ЧЫТАЛЬНЫЯ ЗАЛЫ. КАЛІ ЛАСКА, РЫХТУЙЦЕСЯ, ШТУРМУЙЦЕ КРЭПАСЦЬ, ІМЯ ЯКОЙ — «НАВУКА». РЭКТАРАТ, КАФЕДРЫ ГІСТАРЫЧНАГА, ФІЗІЧНАГА, МАТЭМАТЫЧНАГА, БІЯЛАГІЧНАГА, ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТАЎ ПАКЛАПАЦІЛІСЯ, КАБ ДОБРА БЫЛІ АРГАНІЗАВАНЫ ЛЕКЦЫІ, СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ, КАНСУЛЬТАЦЫІ, ЭКЗАМЕНЫ, КАБ СЕСІЯ ПРАЙШЛА Ў ВАС НА ВЫСОКІМ НАВУКОВЫМ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ УЗРОЎНІ.

ЦЯПЕР ВАША СЛОВА, ТАВАРЫШЫ ЗАВОЧНІКІ!

СЛОВА ГЭТА — ДОБРЫЯ І ВЫДАТНЫЯ АДЗНАКІ Ў ВАШЫХ ЗАЛІКОВЫХ КНІЖКАХ.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 21 (608) Пятніца, 25 чэрвеня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

ДЭБЮТЫ ЗАЛІКОВАЙ КНІЖКІ

Як важна ўзяць добры старт. Радасна ўбачыць першую добрую адзнаку ў заліковай кніжцы. Яна нібы гаворыць студэнту: «Так трымаць»! Шасцікурснік Васіль Праскураў іменна так і пачаў старт. Гартаючы яго заліковую кніжку, бачыш, шасцігадовую універсітэцкую дарогу студэнта. На кожнай старонцы—«добра» і «выдатна». За адзнакамі адчуваеш старанне завочніка, яго эрудыцыю і падрыхтаванасць. Але вось пачаліся дзяржаўныя экзамены. Яны не засталі Васіля Праскурава знянацку.

Дзяржаўная камісія ацаніла веды шасцікурсніка па курсу гісторыі КПСС на «выдатна». Інакш і быць не магло. Ён вельмі многа і старанна рыхтаваўся.

Апошняя сесія для Васіля закончылася. У заліковай кніжцы дабавілася яшчэ адна выдатная адзнака.

Вось чаму на твары журналіста Васіля Праскурава можна ўбачыць шчаслівую усмешку.

К. ВОРАНАЎ.

УСЁ ГАТОВА

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы студэнтаў-завочнікаў аказваюць шматлікія кабінеты нашага універсітэта. Вось, да прыкладу, кабінет «Грамадзянскае права». Не вялікі, але добра ўпарадкаваны пакой застаўлены кніжнымі шафамі. На сценах плакаты, дыяграмы, табліцы.

Лабарантка кабінета Т. А. Чарнабай расказвае:

— У нас студэнт-завочнік можа атрымаць патрэбны падручнік, выкарыстаць усе неабходныя для яго дапаможнікі. Часта сюды прыходзяць і выкладчыкі кафедры правесці кансультацыю на тую ці іншую тэму.

Кабінет сістэматычна забяспечваецца спецыяльнай літаратурай, юрыдычнымі часопісамі.

Г. ФРАЛОВІЧ.



НА ЗДЫМКУ: Студэнткі--завочніцы біялагічнага факультэта ЗІНА ТАЛАЙ, НЭЛЯ ВАЛАДЗЬКО і РАЯ ШЧАРБАК на практычных занятках у лабараторыі.

Фота В. АДЗІЯНА.

РАДАСЦІ, ТРЫВОГІ, РАСЧАРАВАННІ

У БОЛЬШАСЦІ студэнтаў стацыянарнага навучання ўжо закончылася сесія. Здавалася, што аўдыторыі, бібліятэкі, лабараторыі апусцеюць, у іх ужо не будзе клапатлівых дзяўчат і хлопцаў. Але не «перадыхнулі» бібліятэкі і аўдыторыі — яны зноў перапоўнены, — прыехалі завочнікі. Ім у працэсе навучання прыходзілася вельмі многа працаваць самастойна, самім разбірацца ў складаных пытаннях навукі.

Гарачы працоўны рытм адчулі мы на многіх факультэтах, паўсюдна чытаюцца лекцыі, праходзяць семінары. Некаторыя студэнты здаюць ужо экзамены, ліквідуюць акадэмічную запазычанасць.

Ля дзвярэй адной з аўдыторый — многа студэнтаў-юрыстаў. Па ўзросту пазнаеш — «завочнікі». На дзвярах напісана: «Ідуць дзяржаўныя экзамены». Неўзабаве дзверы адчыніліся і на парозе паказаўся студэнт.

— Ну, як? — амаль у адзін голас запыталіся прысутныя.

Замест адказу ён ускінуў уверх пяць пальцаў.

Гэта была ўжо трэцяя «пяцёрка», атрыманая Усанавым на дзяржаўных экзаменах.

Прафесія ў завочніка Дабышука — фельчар; цяга да навукі прывяла яго ва універсітэт, які ён цяпер паспяхова заканчвае. На «добра» і «выдатна» здаў ён дзяржаўныя экзамены. Глыбокія веды паказалі таксама шасцікурснікі Емельянава, Бухель, Шкатула і многія іншыя.

Але не ўсе былі такімі. Некаторыя студэнты прыйшлі на дзяржаўныя экзамены з надзеяй — «як небудзь пранясе». Напрыклад, завочнік Кірэеў не змог адказаць на прасцейшыя пытанні білета і экзаменатара. Слаба ўсвоіў ён матэрыял курса. Таму па «Крымінальнаму праву» і «Савецкаму грамадзянскаму праву» атрымаў «двойкі».

Шкада тое, што Кірэеў не адзін. «Крымінальнае права» не здала таксама Беляева.

Цяжка нават пералічыць, колькі семінараў, спецыяльных кансультацый, лекцый прачыталі выкладчыкі юрыдычнага факультэта, колькі старанняў прыклалі яны, каб выпускнікі-завочнікі паспяхова здалі дзяржаўныя экзамены.

Пачынаецца сесія і на другіх аддзяленнях завочнага факультэта. Студэнтам трэба прыкласці максімум увагі, старання, каб здаць экзамены паспяхова.

Весткі з факультэтаў

Ідуць заняткі ў студэнтаў-завочнікаў біяфака. У іх пачаліся кансультацыі, семінары, лабараторныя работы. Пяцікурснікі ўважліва слухаюць дацэнта Міхаіла Міхайлавіча Драко. Пасля, нібы па камандзе, ўсе схіляюцца над мікраскопамі — вывучаюць тайны расліннага і жывёльнага свету. Піраз год—яны спецыялісты сваёй справы...

Студэнты геаграфічнага факультэта Н. Кучынскі і С. Валюк—настаўнікі школ. Экзамены яны здаюць толькі на «добра» і «выдатна». Гэта лепшыя студэнты курса, таму выкладчык дацэнт Сяргей Міхайлавіч Зубаў назваў іх імёны першымі.

Нялёгка спалучаць вучобу ва універсітэце і адначасова працаваць на вытворчасці.

Але тыя, хто ступіў на такі шлях ідуць па ім цвёрда і ўпэўнена.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.

АДЗНАКА? КАНЕШНЕ, «ВЫДАТНА»

У кожнага чалавека многа свят. І адно з іх—абарона дыпломных работ. Здаецца, ніколі яшчэ нашы выпускнікі не хваляваліся так, як у гэтым годзе!

Стала вядома, што мікрабіёлагі абараняюць дыпломныя работы 16—17 чэрвеня. Яшчэ задоўга да гэтага часу лабараторыі нагадвалі чарцёжныя кабінеты. Чарцёжнікі—самі дыпломнікі. 16-га ніхто не займаўся чарчэннем. На сталах стаялі букеты кветак. Нехта ходзіць і ўслых чытае «абаронную» прамову. Амаль у кожнага запытальны погляд: «Як паступіць экзаменацыйная камісія?» «Як стрымаць хваляванне?»

17. Сёння абараняюцца завочнікі. Вось яны ля кабінета мікрабіялогіі. Дзверы ўпрыгожаны шыльдай: «Ідзе паседжанне ГЭК». Заходзяць і выходзяць адтуль толькі ў час перапынкаў. «Героі» дня—дыпломнікі. Сярод іх Тамара Мікалаеўна Заікіна. Аб ёй я пачула некалькі месяцаў назад. Я ведала, што дыпломная работа Тамары прысвечана РНК—змяшчаючым бактэрыяфагам. У нас, у Савецкім Саюзе, яшчэ не было навуковых прац па гэтым арыгінальным вірусам бактэрый.

Напярэдадні перагартала дыпломную Тамары Мікалаеўны. Ужо адна назва нарадзіла нязвычайную цікаўнасць. Акуратна выкананы ў ёй графікі, многа фотаздымкаў...

І вось работа ў членаў ГЭК. Хутка туды паклічуць і Тамару. Пакуль жа яна працягвае хвалявацца. З Беларускага інстытута мікрабіялогіі і эпідэміялогіі, дзе Тамара Мікалаеўна Заікіна працуе, прыйшлі сябры. Цяпер яны падбадзёрваюць свайго калегу.

— Тамара Мікалаеўна Заікіна!, — пазваў старшыня ГЭК.

Пераканаўча гаворыць Тамара аб біялогіі вельмі маладых бактэрыяльных вірусаў, якія адрозніваюцца ад большасці сваіх «братоў».

За кафедрай—навуковы кіраўнік Тамары Мікалаеўны кандыдат медыцынскіх навук Юрый Канстанцінавіч Фамічоў. Ён даў высокую адзнаку дыпломнай.

— Работы, маючай такую навуковую каштоўнасць,—сказаў прафесар П. Ф. Ракіцкі,— Мы не бачылі на працягу ўсёй абароны дыдыпломных.

Адзнака? «Выдатна»!.

Віншуем, Тамара Мікалаеўна, з першым сур'ёзным навуковым поспехам!

Н. БАТУРЫЦКАЯ,
аспірантка.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЗЯМЛЯ ЦАЛІННАЯ!

15 чэрвеня мінчане праводзілі ў далёкую дарогу першы эшалон са студэнтамі ВНУ рэспублікі. Больш чатырохсот сваіх пасланцаў накіраваў наш універсітэт дапамагаць саўгасам цалінnага края.



Фота **В. Лупейкі.** (БЕЛТА).

Рэпартаж чытайце на 2-й старонцы.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЗЯМЛЯ ЦАЛІННАЯ!

Прыгожай мелодыі песні ўторыць музыка, вясёлы гоман. Ён, здаецца, стаіць паўсюдна на Прывакзальнай плошчы. На вясёлых тварах хлопцаў і дзяўчат — усмешкі. Рантам многагалосы шум сціхае... Пачынаецца мітынг.

З цёплымі словамі на дарогу да ад'язджаючых звяртаецца сакратар ЦК ЛКСМБ Р. С. Піонава і намеснік міністра вышэйшай, сярэдняй, спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР Н. І. Красоўскі. А заслужаны будаўнік БССР, Герой Сацыялістычнай працы С. І. Ярашэвіч уручае камандзіру раённага атрада студэнтаў-цаліннікаў Васілю Чумакову на першы погляд нечаканы, але надзвычай сімвалічны падарунак, якому прадстаіць зрабіць разам са студэнтамі падарожжа на цаліну.

— Гэта — звычайная цагліна. Яна будзе закладзена ў першы падмурак цаліннай новабудоўлі.

З гарачай прамовай выступіў студэнт нашага універсітэта Васіль Чумакоў. Ён заверыў прысутных, што студэнты-цаліннікі зробяць усё магчымае, каб апраўдаць давер'е партыі і народа...

І вось чуецца развітальны гудок цягніка. Усе спяшаюцца да вагонаў. Добраахвотнікі універсітэта і іншых вну рэспублікі едуць ва Уральскую вобласць. Іх будучыя саўгасы — маладыя, нядаўна ўзнікшыя гаспадаркі, і работы там хоць адбаўляй. Але цяжкасці не палохаюць нашых камсамольцаў. Яны ведаюць, што іх месца там, на лініі агню, наперадзе.

Павольна кранаецца эшалон.

Усюды чуваць: «Да сустрэчы, дарагія сябры! Шчаслівай вам дарогі!»

А. ТАБАЧНІКАЎ.

На здымку: Перад ад'ездам на цаліну.

РАЗМОВА ПРА МАЙСТЭРСТВА

Перада мной кніга выкладчыка нашага універсітэта доктара філалагічных навук Ф. Куляшова «Эцюды аб прозе». Сказаць, што тут сабраны літаратурна-крытычныя артыкулы — мала. Відаць, назва кніжкі не выпадковая. «Эцюды аб прозе» Ф. Куляшова — гэта своеасаблівыя літаратурныя нарысы аб творчым шляху вядомых беларускіх пісьменнікаў П. Пестрака, І. Мележа, І. Навуменкі, М. Лынькова і іншых.

Аўтар закранае вельмі важнае пытанне, якое звязана з далейшым развіццём беларускай савецкай літаратуры. Ці варта ў наш час пісаць раманы і іншыя празаічныя манументальныя творы літаратуры? Некаторыя гора-тэарэтыкі вядуць аб гэтым гарачыя спрэчкі. Але ці трэба паглыбляцца ў тэорыю? Жыццё, рэчаіснасць штодзённа абвяргае гэтых аматараў розных «тэорый». Многія празаічныя творы Антычнай літаратуры, літаратуры Сярэдніх вякоў жывуць і будуць жыць яшчэ бясконца год. Гэта гаворыць аб тым, што каштоўнасць рамана захоўваецца і ў наш час. Ён паспяхова развіваецца ў сучаснай літаратуры. І ў гэтым нас пераконвае яшчэ раз кніжка Ф. Куляшова. «Эцюды аб прозе».

Карыстаючыся багатым фактычным матэрыялам, Ф. Куляшоў усебакова разглядае ідэйна-мастацкія асаблівасці некаторых твораў пасляваеннай прозы, дае падрабязны аналіз рабоце многіх аўтараў над словам і вобразам.

Кніжка складаецца з двух раздзелаў. Першы пачынаецца размовай аб рамане І. Мележа «Людзі на балоце». Ф. Куляшоў дае высокую ацэнку раману, ён піша: «Гэты раман бярэш у рукі, як падарунак кваліфікаванага майстра, прачытваеш яго з тым радасным пачуццём, якое заўсёды вызывае ў табе сапраўднае майстэрства».

Падрабязна аналізуе крытык і раман І. Навуменкі «Сасна пры дарозе», разглядае творчы шлях М. Лобана, яго працу над трылогіяй «На парозе будучыні».

Цікавая глава «П. Пестрак як раманіст». Тут Ф. Куляшоў

КНІГІ НАШЫХ АЎТАРАЎ

дае аналіз творчай дарозе П. Пестрака, спыняецца на праблемах яго раманаў «Сустрэнемся на барыкадах» і «Серадзібор». Выказваючы свае меркаванні аб гэтых раманах аўтар не навязвае чытачу сваіх думак, а дае магчымасць яму самому меркаваць, разважаць. Ад гэтага вывады аўтара гучаць яшчэ больш пераканаўча.

Змястоўную гаворку з чытачом вядзе аўтар і ў другім радзеле кніжкі. Тут сабраны артыкулы аб пісьменніцкім майстэрстве Я. Брыля, М. Лынькова, І. Мележа, іх творчай лабараторыі. Крытык падкрэслівае, што літаратурная форма, выпрацоўваецца доўгай і складанай працай аўтара. Сапраўдны майстар слова ніколі не пакіне думкі аб сваёй вялікай адказнасці перад чытачом за якасць напісаных ім твораў, ён заўсёды застанецца патрабавальным да сябе і таварышаў. Такая галоўная ідэя і думка аўтара ў другім раздзеле кніжкі, першая глава якой так і называецца: «Аб патрабавальнасці».

Пазнавальна для пачынаючых пісьменнікаў і журналістаў напісана глава «Два варыянты эпапеі». Тут расказваецца, як працаваў М. Лынькоў над раманам «Векапомныя дні». Збіраліся матэрыялы, пісаліся першыя главы. У 1944 годзе ў газетах паявілася замалёўка «На пераправе». Гэта была, па сутнасці, першая заяўка аўтара на раман, бо пазней яна ўвайшла ў адзін з яго раздзелаў. У 1951 годзе кніжка была выдадзена Белдзяржвыдавецтвам. Але М. Лынькоў не спыніўся на гэтым. Вельмі многае ў рамане перапрацоўваецца, паяўляюцца новыя, героі, эпізоды.

Кніжка Ф. Куляшова дапамагае глыбей унікнуць у творчасць пісьменнікаў.

Т. ПЯТРОВА,
студэнтка пятага курса.



Лета ў разгары.

Фотаэцюд К. МОХАРА.

* * *

Мне порой непонятны
Интегральные дебри,
Электронных машин
Хитроумные схемы,
Мне тогда бы цветов
Да бездонного неба,
Несущего солнце
На квантовых гребнях.
День к концу покидаю
Духоту кабинета
С головою от формул
Бесконечно распухшей.
Мне при встрече кивает
Былинка простая,
Словно другу
С испытанной временем
Дружбой
И тогда вся усталость,
Все дневные заботы,
Всё, что мне угрожало
Новой ночью бессонной,
Растворяется сразу
В теплой зелени парка,
Рассыпается тихо
По спектру газонов.
И у мыслей пытливых
Распрямляются крылья,
Оживают они,
С ними я молодею!
Словно нежная мать
Без остатка все силы
Мне земля отдаёт,
Как когда-то Антею.
Испытать это счастье
Я не смог бы, пожалуй,
Среди трав и цветов
И бездонного неба,
Если б не был знаком
Со значком интеграла
И ни разу б
Смертельно усталый я не был!..

Станіслаў ЗУБОВІЧ

ПА СТАРОНКАХ ФАКУЛЬТЭЦКІХ ГАЗЕТ

На ўсіх факультэтах нашага ўніверсітэта перыядычна выходзяць насценныя газеты. Па свайму зместу і мастацкіх якасцях яны далёка няроўныя. Самую вялікую па памеру газету выпускаюць гісторыкі. На яе старонках можна прачытаць цікавыя карэспандэнцыі і замалёўкі аб выкладчыках і студэнтах, рэпартажы з аўдыторый. З усіх яе нумароў асабліва цікавы апошні. Дастаткова сказаць, што ў ім змешчана каля трыццаці розных матэрыялаў.

Аб чым жа яны расказваюць? Аб зверствах амерыканскіх агрэсараў, аб гарачых днях экзаменацыйнай сесіі, аб размеркаванні выпускнікоў на працу, аб рабоце факультэцкай групы садзейнічання партдзяржкантролю, аб шэфскай рабоце першакурснікаў, цікавых лекцыях і спорце і гэтак далей. У нумары многа крытычных заметак, прычым, крытыка заўсёды дзелавая, без лішняй шумікі і зубаскальства. Газета прыгожа афармляецца, яе ажыўляюць неблагія фотаздымкі, у тым ліку і фотаабвінавачванні. Шкада вось толькі, што іншы раз пад здымкам або няма ніякага падтэкста, або ёсць два-тры словы, якія нічога не гавораць чытачу. І такія хібы ёсць амаль у кожным нумары.

Станоўча адрозніваецца ад яе ў гэтых адносінах газета біялагічнага факультэта. Судзячы па заметках, на яе старонках удзельнічае вялікая колькасць выкладчыцкага і студэнцкага калектыва. Журы адзначыла, што газета біяфака зрабілася свайго роду прыжэктарам факультэта. Таму і не выпадкова яна і на гэты раз няла першае месца.

Значна падцягнулася ў гэтым годзе газета матэматычнага факультэта. На яе старонках цікава асвятлялася жыццё, вучоба студэнтаў. Увагу прыцягвае сатырычная старонка, яна ўмела ілюструецца. Але рэдкалегіі газеты патрэбна больш увагі звярнуць на тэматыку і змястоўнаць матэрыялаў.

Многа чакала журы ад газеты філолагаў. Як ні як, а гэта ж газета літаратурнага факультэта. І каму б, як не яе калектыву, паказваць прыклад у афармленні, змястоўнасці і чытабельнасці матэрыялаў. Але надзеі журы былі дарэмнымі. Газета філолагаў хаця і вялікая па памеру (тры лісты), але ўмяшчаецца ў ёй, як правіла, дзесяць-дванаццаць вялізных артыкулаў.

А вось перад намі яшчэ адна газета — геаграфічнага факультэта. Хаця ў ёй нямала цікавых матэрыялаў, але паглядзіце, як неахайна яны афармлены?

Яшчэ горшае ўражанне пакідаюць газеты хімічнага і юрыдычнага факультэтаў. Праўда, рэдкалегія «Савецкага юрыста» прыкладае многа намаганняў, каб зрабіць сваю газету цікавай і арыгінальнай, але гэта арыгінальнасць нічога не дае. І адна з прычын гэтаму — малы творчы калектыў газеты. Побач са значным ростам насценнага друку універсітэта, журы адзначыла і шэраг агульных недахопаў: мала ў насценных газетах артыкулаў аб партыйным і камсамольскім жыцці, недастаткова асвятляюцца пытанні вучэбнага працэса, рэдка паяўляюцца матэрыялы аб жыцці і вучобе завочнікаў, мала заметак і на маральна-этычныя тэмы. Амаль адсутнічае рубрыка «Па слядах нашых выступленняў». Гэта, бясспрэчна, на многа зніжае баявітасць насценнага друку.

Першае месца з уручэннем рэдкалегіі прыза рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома і мясцкома універсітэта заняла газета біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію».

Другое — з уручэннем «Ганаровай граматы» рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома і мясцкома універсітэта газета «Гісторык».

Трэцяе — з уручэнем «граматы» рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома і мясцкома універсітэта заняла газета матэматычнага факультэта «Рашым любую задачу».

А. КЕРЖАНЦАВА.

БЫВАЙ, УНІВЕРСІТЭТ!

Мне б хацелася, каб у вас застаўся успамін аб універсітэце, аб часе, які вы правялі ў ім, каб ён заўсёды служыў для вас як бы месцам, дзе закладваюцца часціцы чалавечай ідэальнасці, каб ён закладваў у вас імкненне да палёту, таму што той не камуніст, у каго няма імкнення да палёту.

М. І. КАЛІНІН.

Днямі «Маладзёжнае» кафэ, што па вуліцы Кастрычніцкай было перапоўнена. У прасторнай, чыстай зале сабраліся выпускнікі юрыдычнага факультэта нашага універсітэта адсвяткаваць выпускны вечар.

З цёплымі словамі і парадай звярнуўся да іх дэкан факультэта І. М. Ігнаценка:

— Мы вас выхоўвалі некалькі год, аддалі дзеля гэтага многа сіл. І вось сёння настаў час, калі вы павінны зрабіць самастойныя крокі ў сваім жыцці, праверыць сябе на практыцы, чаму навучыліся ў сценах універсітэта. Праверыць і нас, як мы, выкладчыкі, падрыхтавалі вас ў жыццёвую дарогу.

Многа добрых слоў, каштоўных парад далі выкладчыкі В. А. Дарогін, К. А. Барзова і многія іншыя.

Цікавы вечар адбыўся таксама і ў кафэ «Космас». Тут сабраліся студэнты завочнага, вячэрняга і стацыянарнага навучання аддзялення журналістыкі. На ўсё жыццё запамятаюць яны шчырыя настаўленні дэкана філалагічнага факультэта Р. В. Булацкага, дацэнтаў Е. Л. Бондаравай, М. Е. Цікоцкага.

Многа было ў гэты вечар цікавых размоў, успамін.

Выкладчыкі, студэнты адчувалі сябе, як у роднай сям'і. Камісія па правядзенню вечара выпускнікоў запрасіла многа гасцей з другіх вну нашага горада.

Да трох гадзін вечара не змаўкалі ў кафэ песні, музыка, танцы.

— Мы з вамі растаемся, але я не гавару — бывайце назаўсёды — няхай універсітэт увесь час жыве ў вашых сэрцах, — сказаў у заключэнні дацэнт А. А. Галаўко.

Шчаслівай жыццёвай дарогі вам, дарагія таварышы, на прасторах жыцця.

М. СЯРГЕЕЎ.

В. а. рэдактара П. І. ТКАЧОЎ.

АТ 13424 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак.